Калі прытрымліваціа гэтага прынцыпу, то самадзейная творчасць выканае ролю творчай лабараторыі мастацтваў, а не "другога эшалона" мастацтва, як гэта прынята класіфікаваць.

Трэці прынцып — аптымальнае спалучэнне грамадскага, ініцыятыўнага і арганізацыйнага, устаноўчага пачаткаў у развіцці самадзейнай творчасці, паслядоўная арыентацыя на пашырэнне самакіравання.

Наяўнасць розных арганізацыйных формаў быцця самадзейнасці трэба ўсведамляць як норму, якой павінны кіравацца метадычныя службы, упраўленчы апарат, навучальныя ўстановы культуры і мастацтва.

І нарэшце, чацвёрты прынцып, па якім заўсёды ацэньвалася самадзейнасць — масавасць і майстэрства.

Трэба дадаць, што зараз і ў бліжэйшай перспектыве сфера непрафесійнай культурнай дзейнасці зможа найбольш поўна рэалізаваць сваё сацыяльнае прызначэнне, калі будзе дынамічнай, адкрытай насустрач як новым уздзеянням, так і традыцыям. У сувязі з гэтым сёння ў якасці прыярытэтнага для развіцця народнай творчасці і аматарскага руху накірунку трэба вылучыць такі аспект, як актуалізацыя каштоўнасцей мясцовай культуры ў групавой свядомасці і паводзінах людзей, ці дакладней: ажыццяўленне пераходу значнай часткі самадзейных калектываў ад дэманстрацыі ўзораў сусветнай культуры да культурастваральных працэсаў у лакальнай культуры.

У якасці этапаў данага пераходу могуць быць наступныя: першае — усведамленне мясцовай культуры як унікальнай, а таму каштоўнай, якую трэба захоўваць, вывучаць, узнаўляць, дастойна дэманстраваць на ўсіх узроўнях; другое — увядзенне ў абарот каштоўнасцей мясцовай культуры (г. зн. ажыўленне гістарычнай памяці, абыгрыванне прыродных асаблівасцей, анамастыкі, дыялекта, рэканструкцыя фальклору ў жывой традыцыі і інш.), адным словам, тых элементаў, з якіх можна стварыць гарманічныя сістэмы. Унікальнасць і прыгажосць гэтых элементаў павінны быць вылучаны перш за ўсё. Трэцяе — актывізацыя ўласна культуратворчых працэсаў.

Вось у агульных рысах тыя стратэгічныя крокі, якія належыць зрабіць у бліжэйшай перспектыве, каб тое багацце, назва якому — народная творчасць, атрымала новыя імпульсы для свайго прагрэсу.

***С.В. Гуткоўская,***
***загадчык кафедры харэаграфіі Беларускага універсітэта культуры, дацэнт, кандыдат філалагічных навук***

## Аналіз стану самадзейнага харэаграфічнага мастацтва ў рэспубліцы

Самадзейная харэаграфічная творчасць Беларусі сёння — шматжанравая галіна мастацкай культуры. Формы выяўлення танцавальнага мастацтва на аматарскай сцэне разнастайныя. Харэаграфічная самадзейнасць уключае ў сябе сотні калектываў: ансамбляў і студый народнага, класічнага, эстраднага, бальнага і сучаснага танцу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прызначэнне розных тыпаў калектываў — featureрознае. Найбольш масавым застаецца захапленне аматараў народным танцам. Гэты шлях — самы перспектыўны. Безумоўна, што галоўнымі задачамі харэографаў з'яўляюцца вывучэнне ўзораў фальклорнай спадчыны і іх умелая сцэнічная інтэрпрэтацыя з захаваннем своеасаблівага мясцовага каларыту, стварэнне арыгінальнага, самабытнага, тэматычна разнастайнага рэпертуару з улікам спецыфікі выразных сродкаў танца і выканальніцкіх магчымасцей удзельнікаў.

Народная харэаграфія з'яўляецца асновай развіцця любога з накірункаў мастацтва. Фальклор — невычэрпная крыніца ідэй, вобразаў, пластычных фарбаў.

Вялікі ўклад у развіццё харэаграфічнага мастацтва рэспублікі ўносяць фестывалі, якія праводзяцца штогод, і конкурсы ("Чачэрская полька", "Сожскі карагод", "Студэнцкая вясна", "Беларусь — мая песня" і інш.). Пры гэтым задача была адна: прадэманстраваць лепшыя ўзоры харэаграфічнай творчасці, прааналізаваць ход прафесійных дыскусій, вызначыць новыя накірункі развіцця.

Стымулам творчага росту заўжды застаюцца зносіны паміж удзельнікамі і кіраўнікамі, абмен вопытам, параўнанне і погляд з боку, кампетэнтная адзнака, падтрымка аднадумцаў — усяму гэтаму спрыяюць фестывалі.

Апошнія фестывалі выявілі пастановачную фантазію балетмайстраў. З'явілася шмат калектываў, якія пазбеглі ўплыву штампаў. Харэаграфічныя пастаноўкі ў іх выглядалі, можа быць, менш эфектна, чым у вядомых калектывах, але больш сучасна і арганічна.

Разам з тым, захапленне буйнамаштабнымі масавымі пастаноўкамі (вялікія кампазіцыі, танцавальныя сюіты, вакальна-харэаграфічныя сцэны) прывялі да таго, што ўсё радзей сталі з'яўляцца на сцэнічных пляцоўках сольныя танцы, танцы ў выкананні двух-трох танцораў або малых ансамбляў. Каб дасягнуць эфекту знешняга відовішча, харэографы забыліся пра чалавека з яго індывідуальным духоўным светам, своеасаблівай пластыкай, манерай.

Як вельмі станоўчую з'яву трэба адзначыць развіццё дзіцячай харэаграфічнай самадзейнасці, адкрыццё новых дзіцячых харэаграфічных школ і школ мастацтваў. З'явіліся цікавыя знаходкі ў сферы стылізацыі народнага танцу, пошукаў новых сюжэтаў, тэатралізацыі харэаграфічных формаў у дзіцячых калектывах.

Не ўсё гладка ў сферы танцавальнага мастацтва. Далёка не заўсёды балетмайстрамі ўлічваецца ўзровень падрыхтоўкі ўдзельнікаў калектыву, што выклікае не толькі выканальніцкія хібы, але і адмоўна ўплывае на здароўе дзяцей. Неапраўдана імкненне пастаноўшчыкаў пры вырашэнні складаных дарослых тэм. Выкарыстанне невядомага, але моднага матэрыялу вядзе да празмернай псіхалагічнай нагрузкі выканаўцаў і не дае жаданага творчага выніку.

Вялікую зацікаўленасць, асабліва ў моладзі, выклікаюць ансамблі эстраднага танца. Значных поспехаў дасягнулі тыя калектывы, дзе матэрыялам для стварэння сцэнічнай кампазіцыі з'яўляецца сучаснасць ва ўсёй яе разнастайнасці.

Эстрада выконвае сёння ролю "першапраходчыка" новай тэматыкі, пластычных формаў яе ўвасабленняў. Адметнымі рысамі харэаграфічных кампазіцый, што паказваюцца на эстрадзе, з'яўляюцца: забаўляльнасць, дэмакратычнасць, мабільнасць сцэнічных формаў (сола, дуэт, невялікая колькасць удзельнікаў), лаканічнасць афармлення (не патрабуюць спецыяльных сцэнічных пляцовак, дэкарацый). Усё гэта дазваляе эстрадзе ператварыцца ў своеасаблівую творчую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лабараторыю, якая адкрывае новыя творы і для іншых жанраў харэаграфічнага мастацтва.

Невялікая для рэспублікі колькасць ансамбляў бальнага танца тлумачыцца ператварэннем бальнага танца ў спартыўны конкурсны танец і, як вынік, — ухіл у сольны танец. Але менавіта ў ансамблях бальны танец пэўным чынам змяняецца. Адбіраецца рэпертуар, найбольш цікавы для сцэнічнай інтэрпрэтацыі, танцы кампазіцыйна развіваюцца, ускладняюцца малюнкі, выкарыстоўваюцца поліфанічныя прыёмы.

У апошнія гады актывізаваўся працэс пошукаў у галіне сучаснай харэаграфіі. Пачалося спачатку баязлівае, потым усё больш смелае і актыўнае развіццё танца мадэрн, джаз-танца і іншых сучасных пластычных танцаў.

Сёння можна гаварыць аб існуючай заканамернасці — дасягненні самадзейнай сцэны. Безумоўна, яна мае мастацкую значнасць для развіцця харэаграфічнай творчасці ўвогуле. Гэта трэба сказаць і пра дзейнасць таленавітых балетмайстраў, якія працуюць у самадзейнасці ў сферы любых жанраў і формаў танцу (тым больш, што у нас склалася сістэма падрыхтоўкі кадраў педагогаў і кіраўнікоў для аматарскіх калектываў у ВНУ і вучылішчах мастацтваў).

***Н.И. Урюкина,***
***художественный руководитель образцового ансамбля "Лялечкі" Обуховского ЦДК Гродненского района и области, заслуженный деятель культуры Республики Беларусь***

## Творческая характеристика образцового ансамбля танца "Лялечкі" Обуховского ЦДК Гродненского района и области

Наш коллектив существует более 20 лет. Он был создан в декабре 1977 г. при Обуховском ЦДК с целью развития художественных и творческих способностей детей. В коллективе занимаются более 100 детей, которые разделены на 5 возрастных: старшая (7 — 11 кл.); средняя (5 — 6 кл.); младшая (3 — 4 кл.) и две подготовительные группы (1 — 2 кл.).

Обучение танцу начинается с детского сада, где предусматриваются занятия ритмикой. Для занятий в ансамбле принимаются все желающие, начиная с первого класса. Особого отбора нет, потому что это сельская местность с небольшим количеством зрителей. Всего в школе обучаются около 600 человек. Ребята очень много и напряженно работают. Каждая возрастная группа занимается три раза в неделю: младшая — по два часа, старшие — по три часа в день, не считая сводных и генеральных репетиций. Ребята в ансамбле, как правило, все хорошо учатся (это устав коллектива) и, кроме того, многие занимаются в детской музыкальной школе, спортшколе, посещают бассейн, предметные кружки в общеобразовательной школе. Все это создает ряд трудностей — нехватка свободного времени для отдыха, накладка часов для репетиций и тренировок, в результате чего иногда возникают конфликтные ситуации, и зачастую препо-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ